# Адкрылася выстаўка «Кніжныя скарбы Куцеінскага манастыра»

24.10.2023 10:46 | Аўтар: Алена Дзядзюля Фота: Лізавета Голад | Без рубрыкі

**У музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі адкрылася выстаўка «Кніжныя скарбы Куцеінскага манастыра», прымеркаваная да 400-годдзя з дня заснавання на Віцебшчыне Свята-Багаяўленскага храма. У XVII стагоддзі ён стаў адным з буйнейшых асветніцкіх і культурных цэнтраў. Пры манастыры працавалі выдатныя майстры — разьбяры па дрэву, вырабе чэканкі, іканапісцы. Была тут і шыкоўная бібліятэка, дзе захоўваліся друкаваныя і рукапісныя кнігі.**



Але найбольшую вядомасць Куцеінскаму манастыру прынеслі друкары. Пры праваслаўным манастыры ў 1630-1654 гады працавала друкарня, дзе выдавалася навукова-асветніцкая, царкоўна-палемічная і свецкая літаратура на царкоўнаславянскай і старабеларускай мовах. У ёй у 1631 годзе выйшаў і знакаміты буквар Спірыдона Собаля. Арыгіналу старажытнага падручніка, на жаль, у Беларусі няма, але ў Музеі кнігі сёння можна пабачыць факсімільнае выданне буквара, здзейсненае ў 2014 годдзе.



На адкрыцці выстаўкі генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Вадзім Гігін, заўважыў, што манастыр, нягледзячы на тое, што ствараўся ў вельмі няпросты час, адыграў вялікую ролю ў асветніцкай справе, захаванні духоўных каштоўнасцяў, а супрацоўнік Мінскай духоўнай акадэміі Аляксей Дзямідаў распавёў пра гісторыю праваслаўнага цэнтра.



У музее кнігі прадстаўлены рарытэты, як выдадзеныя ў Куцеінскай друкарні, так і тыя, што захоўваліся пры манастыры, пра што сведчаць запісы, зробленыя на кнігах.



На часовай выстаўцы экспануюцца рукапісны помнік — Сінодзік Куцеінскага манастыра XVIII стагоддзя, узор перакладной літаратуры «Гісторыя пра Варлаама і Іасафа», «Актоіх Іаана Дамаскіна», адно з цудоўных літургічных выданняў «Трэфалагіён» і іншыя экспанаты. Прадстаўлены шэраг кірылічных выданняў і рукапісаў XVII-XVIII стагоддзяў з запісамі Куцеінскага манастыра. Сярод іх — рукапісныя ноты «Ірмалогій» XVII стагоддзя, маскоўскія і кіеўскія богаслужэбныя старадаўнія гравюры. Таксама на экспазіцыі змешчаны дакументы, звязаныя з гісторыяй Куцеіснкага манастыра.



















**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**

**Фота Лізаветы ГОЛАД**

Навіны | Папулярнае
09:33 Дзень Віцебскай вобласці пройдзе на міжнароднай выставе імпарту ў Шанхаі
09:16 Мабільныя датчыкі прakантралююць хуткасць на 12 участках у Мінску
08:41 Лукашэнка: ДТСААФ аб'ядн… беззапаветна адданых радзіме, актыўных і энергічных маладых людзей
08:24 Лукашэнка адзначыў уклад … ім. Куляшова ў развіццё Беларусі
08:09 Лукашэнка заявіў аб салідар… падыходах Беларусі і Казахстана … развіцця інтэграцыйных працэсаў
21:32 Аранжавы ўзровень небясп… за моцных дажджоў па поўдні
УСЕ НАВІНЫ
Іншыя матэрыялы аўтара
Святлана Ананьева: Кожная культу… гэта акно ў свет
Пачалося выданне Збору твораў К… Чорнага
Новыя погляды на Максіма Гарэцк…
У Верхнядзвінскім раёне ствараец… новы турыстычны маршрут па востраве Ду
У атачэнні вады, альбо Пра што спрачаліся ў Спораве